УДК 940.5(470)

**А.Л. Дзядзінкін**

# Нацыянальная палітыка савецкай улады на Беларусі ў перыяд грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі (лістапад 1917 – пачатак 1920-х гадоў)

Канцэпцыя нацыянальнай палітыкі бальшавікоў пачала афармляцца яшчэ ў дарэвалюцыйны час і была звязана з імёнамі тэарэтыкаў марксізма-ленінізма.

К. Маркс і Ф. Энгельс сфармулявалі дзве асноўныя пазіцыі ў вырашэнні нацыянальнага пытання ў свеце. Па-першае, марксісцкае вучэнне вызначала жорсткую падпарадкаванасць нацыянальных праблем праблемам класавым: «Диалектика развития нации не является чем-то самостоятельным, – пісаў К. Маркс, – она – производная диалектики развития социальных отношений». Па-другое, К. Маркс і Ф. Энгельс сцвярджалі, што з развіццём «мирового капи-

тализма, всемирного рынка, со свободой торговли» адбываецца уніфікацыя матэрыяльнай сферы жыцця розных народаў, якая вядзе да знішчэння нацыянальных адрозненняў. Таксама лічылася, што «господство пролетариата еще более ускорит процессы разрушения национальных перегородок» [1].

У. Ленін, развіваючы палажэнні марксізма, таксама пісаў, па-першае, аб «идиотской системе мелких государств и национальной обособленности, которая, к счастью человечества, неудержимо разрушается всем развитием капитализма», а па-другое, аб тым, што «целью социализма является не только окончательное уничтожение раздробленности человечества на мелкие государства, не только сближение наций, но и слияние их» [2].

Разам з тым У. Леніна нельга назваць паслядоўным марксістам у вырашэнні нацыянальнага пытання. З аднаго боку, прыярытэтнай для яго, як і для любога старонніка марксісцкага вучэння, з'яўлялася класавая барацьба і ў такім выпадку нацыянальная самасвядомасць як сацыяльная сіла ім недаацэньвалася, аднак, з другога боку, Ленін разумеў, што ва ўмовах, склаўшыхся ў Расіі ў пачатку XX ст., імкненне народаў нацыянальных ускраін да незалежнасці рабіла іх патэнцыяльнымі саюзнікамі бальшавікоў у барацьбе за ўладу. У выніку на дадзенай стадыі гістарычнага развіцця рэвалюцыйным для партыі бальшавікоў стаў лозунг нацыянальнага самавызначэння прыгнечаных народаў. За кожным народам замацоўвалася права атрымаць суверэнітэт або ўвайсці ў склад Расійскай дзяржавы на правах аўтаномнай адзінкі.

Захапіўшы ў кастрычніку 1917 года ўладу ў Петраградзе, бальшавікі ўнеслі пэўныя карэкцівы ў нацыянальную праграму партыі. У. Ленін прыйшоў да высновы, што партыя менш за ўсё можа схіліць народы Расіі на свой бок заклікамі да барацьбы за ажыццяўленне канчатковай мэты ў нацыянальным пытанні. З гэтай прычыны адразу ж пачапося «прыстасаванне прынцыпаў камунізма» да нацыянальных інтарэсаў. Савецкая нацыянальная палітыка гэтага часу вызначалася галоўным чынам ідэямі папулізму, сугучнымі з народнай верай у магчымасць справядлівага вырашэння нацыянальных праблем, а таксама прагматызмам партыйнай праграмы, арыентаванай на забеспячэнне масавай падтрымкі новай уладзе ў асяроддзі этнічна нерускага насельніцтва.

Ужо ў звароце II Усерасійскага з'езда Саветаў да рабочых, салдат і сялян (25.10.1917 г.) адзначалася, што савецкая ўлада «обеспечит всем нациям подлинное право на самоопределение». «Дэкларацыя правоў народаў Расіі» (2.11.1917 г.) гарантавала неадкпаднае разняволенне народаў, знішчэнне ўсялякага прыгнёту. «Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа» (12.01.1918 г.) устанаўлівала, што «Российская республика учреждается на основе союза свободных наций как федерация советских национальных республик» [3].

Заканадаўча правы нацыянальных меншасцей былі замацаваны ў Канстытуцыі РСФСР 1918 г. У артыкуле 22-м адзначалася: «признаются равные права за гражданами независимо от их расовой и национальной принадлежности ... не допускается установление каких-либо привилегий на этом основании, а равно какое бы то ни было угнетение национальных меньшинств» [4].

Нарэшце, у час работы VIII з'езда РКП(б) 18-23 сакавіка 1919 г. была канчаткова пацверджана пазіцыя партыі ў галіне рэгулявання нацыянальных адносін. Абвяшчаныя на з'ездзе прынцыпы нацыянальнага самавызначэння народаў і забеспячэння свабоднага развіцця нетытульных этнічных супольнасцей Расіі, як бачна, сталі тымі двума тактычнымі напрамкамі палітыкі бальшавікоў, якія рэалізоўваліся ва ўмовах грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі.

Абвяшчаючы права нацый на самавызначэнне ў якасці асноўнага лозунга праграмы партыі па нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву, бальшавікі

імкнуліся да папулярызацыі партыйнай лініі ў нацыянальных рэгіёнах дзяржавы і хацелі прыпыніць далейшую актывізацыю так званых «буржуазных» нацыянальна-вызвапенчых рухаў.

Сапраўды, з канца 1917 г. на ўскраінах Расіі пачалі ўзнікаць новыя дзяржаўныя ўтварэнні і мясцовыя ўрады, якія прэтэндавалі на незалежнасць. Рэвалюцыянізаваць новаўтварэнні бальшавікі меркавалі пад лозунгамі іх самавызначэння ў савецкай форме. Такая пазіцыя тлумачылася тым, што яна «отнимет возможность у национал-шовинистов рассматривать движения наших частей как оккупацию». Па ацэнцы І. Сталіна, «правильная политика партии в национальном вопросе облегчила победу над эсерами, меньшевиками, над Деникиным и Колчаком по крайней мере на пятьдесят процентов» [5].

Ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі савецкай улады ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі мела пэўныя адметнасці.

Найбольш складанай з'яўлялася праблема стварэння беларускай дзяржаўнасці. Сітуацыя абвастралася тым, што ў рашэнні гэтай задачы адначасова прымалі ўдзел некалькі палітычных сіл : 1) нацыянальныя партыі, якія групаваліся вакол Вялікай беларускай рады (ВБР); 2) ЦК РКП(б) і Наркамнац; 3) кіраўніцтва Заходняй вобласці; 4) Беларускі абласны камітэт, Белнацкам і беларускія камуністычныя секцыі.

У першую чаргу супярэчанні ўзніклі паміж Аблвыканкамзахам, дзеячы якога не лічылі беларусаў за нацыю, выступаючы за захаванне абласной сістэмы і ВБР, якая не прызнала ўладу бальшавікоў на Беларусі.

Кіраўнікі беларускага нацыянальнага руху, выкарыстаўшы абвешчанае бальшавікамі права нацый на самавызначэнне, лічылі нацыянальнае адраджэнне Беларусі галоўным у сваёй праграме. Аднак, ажыццявіць гэтую задачу сваімі сіламі для беларускіх нацыянальных партый увосень 1917 г. было нерэальна. Аб іх удзельнай вазе ў палітычным жыцці краіны сведчыў той факт, што на выбарах ва Устаноўчы сход самая значная нацыянальная партыя – Беларуская сацыялістычная грамада – набрала толькі 0,3% галасоў выбаршчыкаў [6].

Для рэалізацыі ідэі самавызначэння Беларусі Вялікая беларуская рада ўступіла ў перагаворы з выканкамам Беларускага абласнога камітэта (БАК), які быў створаны з дэлегатаў ад беларускіх губерняў на І Усерасійскім з'ездзе сялянскіх дэпутатаў у лістападзе 1917 г. Менавіта БАК падаў хадайніцтва ў Наркамнац РСФСР аб правядзенні Усебеларускага з'езда для вырашэння пытання аб самавызначэнні Беларусі.

Кіраўніцтва Наркамнаца РСФСР, даўшы дазвол на правядзенне з'езда, ставіла галоўнай мэтай паралізаваць намеры ВБР дабіцца аддзялення Беларусі ад Расіі. Такім чынам, бальшавікі хацелі стварыць савецкую альтэрнатыву так званаму «буржуазнаму» нацыянальнаму блоку. Сапраўды, у сваім «Звароце да беларускага народа» Беларускі абласны камітэт у процівагу палітычным ідэалам ВБР аб незалежнай Беларусі выступіў з ініцыятывай утварыць аўтаномную Беларусь у складзе Расійскай Федэрацыі. У такім выпадку зразумелым становіцца і рашэнне СНК Заходняй вобласці аб роспуску з'езда. Гэта адбылося пасля таго, як удзельнікі з'езда прынялі рашэнне пазбавіць Аблвыканкамзах уладных паўнамоцтваў і ўтварыць новы, непадпарадкаваны бальшавікам, орган улады на Беларусі – Усебеларускі Савет сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Як бачна, бальшавікоў на дадзеным этапе мог задаволіць толькі варыянт стварэння савецкай нацыянальнай дзяржаўнасці, а ў выпадку перахопу ініцыятывы «буржуазнымі» сіламі партыйныя органы адносна іх прымянялі тактыку фізічнай расправы.

Такім чынам, першая спроба стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці не была рэалізавана, хаця ва ўмовах канца 1917 г., калі бальшавікі

яшчэ толькі прыйшлі да ўлады і паслядоўна рэалізоўвалі прынцып нацыянальнага самавызначэння (няхай толькі ў савецкай форме) была рэальная магчымасць стварыць Беларускую рэспубліку.

Другая спроба стварэння беларускай дзяржаўнасці адбылася ўжо напрыканцы 1918 г. у новых палітычных умовах. Вышэйшыя органы ўлады РСФСР цяпер самі ініцыявалі гэты працэс, на што былі свае прычыны.

Па-першае, па-ранейшаму захоўвалася неабходнасць стварыць савецкую альтэрнатыву «буржуазнаму» руху.

Па-другое, праводзячы дэмакратычныя пераўтварэнні ў Расіі, бальшавікі ставілі задачу ўзняць аўтарытэт Камуністычнай партыі ў асяроддзі заходнееўрапейскага пралетарыяту, які разглядаўся як рухаючая сіла сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Па-трэцяе, у сувязі з абвастрэннем адносін паміж РСФСР і Польшчай і абвяшчэннем савецкіх рэспублік у Прабалтыцы і на Украіне партыйныя органы ўлады не маглі не вырашыць праблему беларускага рэгёна, дзе працягвала існаваць Заходняя вобласць. Утварэнне Беларускай рэспублікі павінна было завяршыць фарміраванне буфернай зоны на заходніх межах Савецкай Расіі.

Рашэнне ЦК РКП(б) аб утварэнні беларускай савецкай дзяржаўнасці было прынята 24.12.1918 г., а 27.12.1918 г. Наркамнац выдаў пастанову «Аб практычных мерапрыемствах па ўтварэнню БССР». Нарэшце, 30.12.1918 г. на VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі РКП(б) была прынята рэзалюцыя аб абвяшчэнні самастойнай «социалистической республики Белоруссии из территорий Минской, Гродненской, Витебской, Могилевской и Смоленской губерний» [7].

На карысць таго, што стварэнне БССР ва ўмовах канца 1918 г. было прадыктавана ў большай меры знешнепалітычнымі прычынамі, сведчыць рашэнне ЦК РКП(б) ад 16.01.1919 г. аб вылучэнні са складу БССР Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай губерній і далучэнні гэтых тэрыторый да РСФСР. Як бачна, партыйныя органы ўлады не бачылі сэнсу ў тым, каб пакідаць у складзе буфернай дзяржавы губерні, якія не прымыкаюць непасрэдна да дзяржаўнай мяжы.

Мэтамі ўмацавання буфернага блоку было прадыктавана рашэнне партыі аб аб'яднанні савецкіх рэспублік Беларусі і Літвы ў ЛітБелССР. У выніку 3.02.1919 г. на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў, а 17.02.1919 г. на I з'ездзе Саветаў Літвы былі прыняты адпаведныя дэкларацыі, пасля чаго 27.02.1919 г. адбылося афіцыйнае аб'яднанне дзвюх савецкіх рэспублік. З гэтага часу БССР як самастойная дзяржава юрыдычна перастала існаваць, ды і ЛітБелССР, акупіраваная польскімі войскамі, ужо з лета 1919 г. з'яўлялася хутчэй фармальным утварэннем.

Пасля вызвалення Беларусі ад польскіх інтэрвентаў 31.07.1920 г. адбылося паўторнае абвяшчэнне БССР. Як бачна, курс бальшавікоў, накіраваны на стварэнне ў нацыянальных рэгіёнах Расіі савецкай дзяржаўнасці, на момант завяршэння грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі заставаўся нязменным.

Такім чынам, палітычныя ідэалы дарэвалюцыйнай праграмы бальшавікоў заключаліся ў тым, каб замяніць данацыянальнае ўладкаванне «царскай» Расіі постнацыянальным і па магчымасці пазбегнуць той стадыі развіцця грамадства, якая звязана з фарміраваннем нацыянальнай дзяржаўнасці. Аднак, калі Камуністычная партыя прыйшла да ўлады і справа дайшла да практычнай рэалізацыі прынцыпаў нацыянальнай палітыкі, бальшавікі адмовіліся ад сваіх ідэалагічных перакананняў і звярнуліся да прынцыпу федэралізма. Дыялектыка Леніна была заклікана дагадзіць як нацыянальным памкненням у барацьбе за незалежнасць, так і камуністычным мэтам інтэграцыі. Бальшавікі вырашылі

стварыць у якасці пераходнай формы да цэнтралізаванай дзяржавы незалежныя савецкія сацыялістычныя рэспублікі.

У гэты ж час на неакупіраванай частцы Беларусі, якая ўваходзіла з пачатку 1919 г. у склад двух дзяржаўных утварэнняў, – БССР (з 27.02.1919 да канца ліпеня 1920 г. ЛітБел ССР) і РСФСР – пачалі ажыццяўляцца і мерапрыемствы, накіраваныя на забеспячэнне свабоднага развіцця ўсіх этнічных супольнасцей рэгіёна. На тэрыторыі Віцебскай і Гомельскай губерній РСФСР мерапрыемствы ажыццяўляліся ў адпаведнасці з дэкрэтамі савецкіх органаў улады лістапада 1917-1918 гг. У БССР (ЛітБелССР) пачала стварацца свая заканадаўчая база па рэгуляванню нацыянальных адносін. У Маніфесце часовага ўрада БССР (1.01.1919 г.) адзначалася: «Рабочыя, сяляне і ўвогуле працоўныя ўсіх нацыянальнасцей карыстаюцца роўнымі правамі і знаходзяцца пад абаронай рэвалюцыйных законаў». У Канстытуцыі БССР 1919 г. таксама дэкларавалася раўнапраўе ўсіх нацыянальных супольнасцей. Урад ЛітБелССР 21.03 1919 г. прыняў спецыяльны дэкрэт «Аб правах нацыянальнасцей», дзе адзначалася, што «все национальности Литовско-Белорусской Республики уравниваются в своих правах ... Пять языков – литовский, польский, еврейский, русский и белорусский считаются общегосударственными языками».

Як бачна, савецкія органы ўлады асэнсоўвалі, наколькі важнай з'яўлялася ў перыяд грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі задача рэгулявання міжнацыянальных адносін у беларускім рэгіёне. Каб стварыць перадумовы для паляпшэння міжнацыянальных адносін у рэгіёне, пераадолець недавер паміж народамі Беларусі, бальшавікі прыступілі да стварэння дзяржаўных органаў улады, якія б займаліся непасрэдна рэалізацыяй нацыянальнай праграмы партыі.

Ужо ў лістападзе 1917 г. пачаў сваю работу Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей РСФСР. Пры Наркамнацы з пачатку 1918 г. пачалі арганізоўвацца ў якасці аддзелаў яўрэйскі, польскі, латышскі, украінскі, беларускі і іншыя камісарыяты. У студзені 1918 г. Наркамнац выдаў інструкцыю «Аб арганізацыі аддзелаў па справах нацыянальнасцей на месцах». З гэтага часу ў мясцовасцях з поліэтнічным складам насельніцтва на роўных правах з іншымі аддзеламі губвыканкамаў утвараліся адпаведныя нацыянальныя секцыі.

Так, пры Віцебскім і Гомельскім губвыканкамах на працягу 1919 г. былі створаны яўрэйскія, польскія і латышскія секцыі. Праўда, арганізаваць беларускія секцыі да канца 1920-га года так і не ўдалося. Да прыкладу, кіраўніцтва Віцебскай губерні спасылаючыся на абмежаваныя фінансавыя магчымасці, адсутнасць кадраў, падкрэслівала, што стварэнне белсекцыі «на данном этапе несвоевременно» [8], гэта толькі пашырыць апарат і прывядзе да паслаблення партыйнай работы, якая будзе ў такім выпадку ажыццяўляцца на мове, незразумелай масам. Як вынік, у гады знаходжання Віцебшчыны ў складзе РСФСР на тэрыторыі губерні не было арганізавана ніводнай школы ці культурна-асветнай установы на роднай мове дамінуючага насельніцтва. У той жа час вялася значная работа па абслугоўванню насельніцтва іншых нацыянальнасцей губерні [9].

Справа забеспячэння свабоднага развіцця нацыянальных меншасцей на тэрыторыі БССР (ЛітБелССР) адбывалася ў складаных умовах ваеннага часу. З гэтай прычыны арганізацыя нацыянальных секцый пры ЦК КП(б)Б адбывалася толькі ў канцы 1920 г. Адпаведна рашэнням III з'езда КП(б)Б (22-26 лістапада 1920 г.) пры Наркамаце асветы БССР былі створаны яўрэйская, літоўская і польская секцыі [10]. Такім чынам, асноўная работа па вырашэнню сацыяльна-эканамічных і культурна-адукацыйных праблем нацыянальных меншасцей Беларусі разгарнулася толькі з пачатку 1920-х гадоў.

Як бачна, у перыяд грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі бальшавікі вымушаны былі вырашаць нацыянальнае пытанне ў краіне. У значнай ступені ад гэтага залежала наколькі трывалай будзе іх улада на ўскраінах Расіі. Зразумела, дэкларацыя і ажыццяўленне прынцыпаў нацыянальнага самавызначэння (у савецкай форме!) і забеспячэння раўнапраўя ўсіх народаў Расіі найбольш адпавядала ўнутрыпалітычнай сітуацыі і знешнепалітычным абставінам 1917-1920 гадоў. Разам з тым нельга лічыць, што абвяшчаючы такі дэмакратычны курс у вырашэнні нацыянальнага пытання, бальшавікі імкнуліся да тэрытарыяльнага разбурэння Расіі. Наадварот, прадугледзеўшы, што «признание права на отделение уменьшает опасность распада страны», яны імкнуліся праз выкарыстанне такіх сродкаў захаваць на дадзеным этапе цэласнасць дзяржавы. Больш таго, такім чынам закладваліся асновы для фарміравання «дружбы народаў», якая з'яўлялася асноўным фактарам саветызацыі нацыянальнага насельніцтва.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Маркс К., Энгельс Ф.*** Соч., 2 изд., т. 32. М., 1962. С. 101.
2. ***Ленин В.И.*** Полн. собр. соч., 5 изд., т. 18. М., 1963. С. 134.
3. ***Политика советской власти по национальным делам за три года*** (1917-1920). М., 1920. С. 42-44.
4. ***Советские Конституции***. Справочник. М., 1963. С. 43.
5. ***Сталін І.В.*** Нацыянальнае пытанне і ленінізм. Мн., 1953. С. 84
6. ***Нарысы гісторыі Беларусі***: У 2 ч. Ч. 2 / ***М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і інш.*** Мн, 1995. С. 53.
7. ***Истории Беларуси в документах и материалах***. Мн., 2000. С. 339.
8. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ).*** Ф. 118, воп. 1, спр. 34, арк. 12.
9. ***ДАВВ.*** Ф. 10050, воп. 1, спр. 116, арк. 8.
10. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*** Ф. 4-п, воп. 1, спр. 34, арк. 145.



## SUMMARY

*The object of our research is the national politics of the soviet Power in Belarus during the Civil War. The author has analyzed some questions of national state politics and international relationships.*



*Поступила в редакцию 30.05.2003*